# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 47 (96), 6-12. 12. 2007 г.

# У ЧАКАННІ ПУЦІНА

## “ЗАЎТРА ЯНЫ ПРЫНЯСУЦЬ ВЯРОЎКУ І ПАВЕСЯЦЦА”

На трэці дзень пасля расійскіх выбараў у Думу нарадзілася ці не галоўная сенсацыя нашага часу: у Мінск едзе прэзідэнт Пуцін. Як паведамляе дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БелТА, 13-14 снежня адбудзецца пасяджэнне “Вышэйшага дзяржсавета саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі”, падчас якога Лукашэнка і Пуцін “маюць намер дэтальна абмеркаваць перспектывы прыняцця Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы”.

Не паспела гэтая навіна абляцець беларускі інтэрнэт, як на многіх сайтах з’явіліся экспрэс-водгукі палітычных каментатараў. Амаль усе б’юць трывогу: незалежнасць Беларусі пад пагрозай! У пацвярджэнне гэтай тэзы адзін з аўтараў прыводзіць той факт, што візіт Пуціна будзе доўжыцца ажно два дні – за гэты час, маўляў, можна напрымаць шмат лёсавызначальных рашэнняў.

Пішуць, што для Пуціна ўзначаліць Вышэйшы дзяржсавет (які цяпер, нагадаем, узначальвае Лукашэнка) – спосаб захаваць усю паўнату ўлады ў Расіі пасля абрання ў сакавіку новага прэзідэнта РФ. Дарэчы, ужо 17 снежня можа быць названае імя “пераемніка”.

Ну, а Лукашэнку за лаяльнасць Пуціну будуць ільготы на расійскі газ і іншыя эканамічныя прэферэнцыі…

Цікава, што расійскія СМІ, найперш – інтэрнэт, значна больш спакойна адрэагавалі на навіну. А дакладней сказаць – ніяк не адрэагавалі. Не кажучы ўжо пра адміністрацыю прэзідэнта РФ, якая захоўвае маўчанне на гэтую тэму. Што тычыцца маючага адбыцца пасяджэння ў Мінску, дык інфармацыйнае агенцтва РИА “Новости” са спасылкай на прэс-службу расійскага ўраду паведаміла наступнае: “Прэм’ер-міністр РФ Віктар Зубкоў абмеркаваў па тэлефоне са сваім беларускім калегам парадак маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі і планаванага прыканцы снежня пасяджэння Савета міністраў саюзнай дзяржавы”.

Пра запланаваную сустрэчу Пуціна і Лукашэнкі – ані слова. Хоць гэты факт і расійскую прэсу павінен быў бы цікавіць. Усё-ткі першы дзяржаўны візіт “нацыянальнага лідэра” за мяжу пасля гістарычнай перамогі прапуцінскай “Адзінай Расіі” і пераканфігурацыі ўлады.

Прычым, размова ідзе нават не пра візіт Лукашэнкі ў Маскву, які абяцаў, што нагі яго больш не будзе ў Крамлі, а пра візіт Пуціна ў Мінск, то



**“Брэжневуцін”**. *Мал. leprosorium.ru*

бок на паклон Лукашэнку…І гэта павінен зрабіць чалавек, які вельмі паважліва ставіцца да сваёй персоны. Нездарма Пуцін заўсёды спазняецца, нават на сустрэчы на вышэйшым дзяржаўным узроўні. Аднойчы ён умудрыўся спазніцца на спатканне з брытанскай каралевай.

Што павінна было здарыцца надзвычайнага, каб прымусіць прэзідэнта Расіі забыц-

**Заканчэнне на стар. 4**

## ЧАМУ ВЕНЕСУЭЛА НЕ БЕЛАРУСЬ

АРТЫКУЛ ВАЛЕРЫЯ ФІЛІНА НА СТАР. 5

## ЦІ ЗМУСЯЦЬ НАС ВЯРНУЦЦА Ў БЫЛУЮ ІМПЕРЫЮ?

АПЫТАННЕ НАСТУПНАГА ТЫДНЯ

# ЦІ ВАЖНЫЯ ВЫБАРЫ Ў РАСІІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ?

**АЛЯКСАНДР ДАБРАВОЛЬСКІ, АБ'ЯДНАНАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАРТЫЯ:**

## "ГЭТА ЎСЁ НАГАДВАЕ БЕЛАРУСЬ"

Пераможцы былі вядомыя адразу. І ўлада зрабіла ўсё, каб тыя людзі, якіх яна не можа выкарыстаць, наогул не трапілі ў Дзяржаўную думу. Большае значэнне тут мае не вынік выбараў, які быў вядомы, а сам характар выбарчай кампаніі. Гэтая кампанія вельмі мала нагадвала выбары. Людзей арыштоўвалі, не давалі распаўсюджваць агітацыйную прадукцыю. Гэта ўсё нагадвае Беларусь. І ў нас, і ў Расіі ўлада мае за мэту не зрабіць нешта добрае для краіны, а захаваць уладу. Крыўдна, што ў Расіі, якая з'яўляецца для нас вялікім суседам, у Думе няма ніводнага прадстаўніка, з якім можна было б нармальна гаварыць.

**КАНСТАНЦІН, МЕНЕДЖЭР:**

## "НЕ ТРЭБА ЕЗДЗІЦЬ У РАСІЮ"

У сённяшняй Расіі Беларусь можа пабачыць сябе. Тое, што там робіцца – гэта не дасягненне Пуціна. Маятнік пайшоў у другі бок. Расія вяртаецца ў свой нармальны стан усходняй дэспатыі. Усе сімпатычныя людзі, якія з гэтай нагоды вельмі моцна хвалююцца, павінны супакоіцца і цвяроза паглядзець праўдзе ў вочы. Не Пуцін загадваў зрабіць у Чачні 99 працэнтаў. І ўсё астатняе, пачынаючы ад урачыстай сустрэчы Калоева-забойцы і сканчаючы лізаблюдскім шабасам у Цверы, не Пуцін натхняў. Юрысты ўжываюць такі тэрмін, як "эксцэс выканаўцы". І ўсе гэтыя маленькія выканаўцы, як у Расіі, так і ў нас, спаборнічаюць у тым, хто глыбей лізне. Праблема не ў тым, што нешта не так лічылі, ці кагосьці не пусцілі да мікрафона. Праблема ў тым, што "Яблоко" ды "СПС" зашмат часу і энергіі змарнавалі на разборкі паміж сабой. Тое самае адбываецца і ў нас. Для нас гэтыя выбары – добры паказнік таго, што не трэба ездзіць у Расію, з кімсьці гаварыць пра нашу свабоду і спадзявацца на нейкае паразуменне. Адзіная выснова – трэба плённа займацца працай і менш энергіі марнаваць на разборкі паміж сабой.

**ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ, АНАЛІТЫК:**

## "ВЫБАРЫ ТАМ – ГЭТА РЫТУАЛ"

Наўрад ці. Бо яны страцілі значэнне ў самой Расіі. Выбары там больш не з'яўляюцца механізмам змены ўлады. Гэта цырыманіяльны рытуал, які збольшага нагадвае беларускія выбары. Расійскія выбары не маюць дачынення ні да раскладу ўладаў, ні да балансу сілаў. У Расіі працуюць тэхналогіі знішчэння палітычных альтэрнатываў.

**АЛЕГ, НАСТАЎНІК:**

## "ГЭТА АДРАДЖЭННЕ ІМПЕРЫІ"

Пра якія выбары вы гаворыце? Гаварыць трэба пра адраджэнне Расійскай імперыі. Ці мае значэнне адраджэнне імперыі для яе калоніяў? Прыпячэ так, што мала не падасца нікому. Ні Лукашэнку, ні апазіцыі, ні так званаму простаму чалавеку. За сваю незалежнасць трэба будзе заплаціць той манетай, якую плацілі ўсе нашыя суседзі. А інакш – расійскі пашпарт з усімі выцякаючымі наступствамі.

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА, СТАРШЫНЯ БНФ:**

## "НІЯКІХ ЗМЕНАЎ"

Для Беларусі мае значэнне тое, што Расія наш сусед на Ўсходзе. І ў гэтым сэнсе палітычныя падзеі, якія там адбываюцца, для нас значэнне маюць. Той спектакль, які быў на днях, прынцыпова нічога не памяняў у расійскай палітыцы. Толькі пацвердзіў, што яна ўпэўнена пераходзіць да аўтарытарнай дзяржаўнай мадэлі. А ўслед за ёй – і да таталітарнай. На ўзроўні ідэалагічных штампаў там адраджаецца імперыялізм, які на практыцы нікуды не дзяваўся. І ў гэтым сэнсе ніякіх зменаў у палітыцы стасоўна Беларусі ў Расіі не будзе. Ну, а калі гаварыць пра тое, што там лідэрам апазіцыйных партый ламаюць рукі, геніяльных людзей садзяць на іхныя "акрэсціна"... Гэта ў тых на Захадзе, хто яшчэ спадзяваўся, што светачам дэмакратыі для Беларусі можа быць Расія, адбірае такія аргументы. Можа, у гэтым ёсць адзіны пазітыў з таго, што мы назіралі апошнімі месяцамі.

**ВАЛЯНЦІНА, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## "МЫ ПАД НАДЗЕЙНЫМ ПАРАСОНАМ"

Абсалютна не мае ніякага значэння. Каго б яны ні выбралі, пакуль у нас ёсць Лукашэнка, мы пад надзейным парасонам. Хай падымаюць цэны на газ, хай спрабуюць тут усё паскупляць. Нічога ў іх з гэтага не атрымаецца.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, АНАЛІТЫК:**

## "НЕМАГЧЫМА НЕ ЦІКАВІЦЦА НАДВОР'ЕМ У АКІЯНЕ"

Думаю, што ўсе кропкі над "і" расстаўленыя. Для Беларусі мае значэнне ўсё, што адбываецца ў Расіі. Таму што, калі жывеш на ўскрайку лесу, пустыні, акіяну, усё, што адбываецца ў гэтай стыхіі, важна для тых, хто жыве побач. Немагчыма не цікавіцца надвор'ем у акіяне, калі ты жывеш на яго беразе. Вее холадам. Дэмакратыя ў Расіі згорнутая. На сённяшні дзень мы маем толькі афіцыйны Крэмль. І ніякіх іншых суб'ектаў, з якімі мы маглі б мець дачыненні, і з якімі мы, так бы мовіць, маглі б гуляць на ўсходнім палітычным полі, у нас больш няма і не будзе.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "БОЛЬШ, ЧЫМ ДЛЯ РАСІЯНАЎ"

Расійскія выбары для Беларусі, магчыма, значаць больш, чым нават для саміх расіянаў. Мы не проста звязаныя. Мы знітаваныя, калі заўгодна, з Расіяй эканамічна, палітычна, інфармацыйна, культурна і гэтак далей. І разам з тым, мы не маем механізму, каб нейтралізаваць усе гэтыя ўплывы. Калі ў Расіі адбываецца нават не змена курсу, а змена канфігурацыі палітычнай улады, для яе гэта натуральна. Але гэтая змена не супадае з логікай нашага развіцця. Мы мусім улічваць і нават падпарадкоўвацца гэтай чужой логіцы. Расія вяртаецца ў сваё візантыйства, да аўтарытарна-паліцэйскай дзяржавы. З гэтага вынікае, што ў Расіі ўсё больш абуджаюцца яе імперскія комплексы. І я не выключаю, што яшчэ праз адны-другія выбары гэтыя комплексы перамогуць. Расія проста змушана будзе, тоесна са сваёй натурай, заняцца "збіраннем земляў". І таму, мне здаецца, і Еўропа, і Амерыка, і найперш Беларусь павінны вельмі сур'ёзна паставіцца да тых палітычных тэндэнцый, якія адбываюцца ў Расіі. Бо калі я ў сваіх прагнозах не памыляюся, гэта можа скончыцца для нас вельмі нядобра. Мы памятаем, чым скончылася збіранне земляў у Нямеччыне пасля І-й сусветнай вайны. Для Беларусі абсалютна ясна – пакуль яна не будзе абаронена Еўразвязам, кожныя наступныя выбары ў Расіі будуць несці пагрозу яе каштоўнасцям. Найперш – незалежнасці.

Каментарыі на стар. 1 і 4

# ПІШАШ ПА-БЕЛАРУСКУ – У "ПСІХУШКУ"

Медкамісія Гомельскага ваенкамата накіравала прызыўніка Змітра Жалезнічэнку на псіхіятрычную экспертызу ў абласную псіхіятрычную клініку. Лекарка-псіхіятр з прызыўной камісіі выпісала Жалезнічэнку накіраванне пасля таго, як ён адмовіўся запаўняць анкету прызыўніка па-расійску, патлумачыўшы, што ваенком Цацарын абяцаў яму выдаць адпаведны фармуляр на беларускай мове. Папярэдне лекарка паставіла Жалезнічэнку дыягназ "рэакцыя апазіцыі".

Да нядаўняга часу Зміцер Жалезнічэнка вучыўся на 3 курсе матэматычнага факультэту Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Францішка Скарыны. За выдатную вучобу ён атрымліваў падвышаную стыпендыю. Аднак сёлета ў верасні яго за грамадскую дзейнасць адлічылі з універсітэту – нібыта за парушэнне правілаў унутранага распарадку.

**Паводле Радыё Свабода**

# ЧАРГІНЕЦ СУПРАЦЬ "НОВАГА ЧАСУ"

5-га снежня ў Мінску адбылося дасудовае разбіральніцтва паводле скаргі члена Савета Рэспублікі Мікалая Чаргінца аб абароне гонару і годнасці. Суд прызначаны на 19 снежня.

Некалькі тыдняў таму Чаргінец падаў скаргу ў суд Першамайскага раёна сталіцы на газету "Новы час" і журналіста Аляксандра Тамковіча. Прэтэнзіі скаржніка выклікаў нарыс Тамковіча пад назвай "Генерал-сенатор Чергинец". Герой нарыса палічыў сябе зняважаным, напрыклад, словамі аўтара пра тое, што Чаргінец узначаліў "правільны Саюз пісьменнікаў" – Саюз пісьменнікаў Беларусі. Ён адмовіўся пайсці на міравую і пацвердзіў у судзе свой намер дамагацца выплаты кампенсацыі за маральны ўрон.



**Мікалай Чаргінец**



**Аляксандр Тамковіч**

Былы міліцыянер, аўтар дэтэктываў патрабуе ад газеты "Новы час" 500 мільёнаў рублёў. Ад Тамковіча – яшчэ 100 мільёнаў. Сам журналіст не змог прыйсці з-за сваёй хваробы, аднак суд не палічыў гэта важкай падставай для пераносу справы. Пра тое, што Аляксандр Тамковіч апошнія некалькі гадоў пакутуе на цяжкую хваробу, Мікалай Чаргінец ведае.

У судзе ў якасці назіральнікаў прысутнічалі праваабаронца Валеры Шчукін і прадстаўнік пасольства ЗША Стывен Гілен.

Тым часам прэс-сакратар вярхоўнага камісара Еўразвязу Хаўера Саланы Крыстына Галах паведаміла, што ў Радзе ЕЗ будуць сачыць за гэтай судовай справай, бо там лічаць патрабаванні Чаргінца празмернымі і палітычна матываванымі.

# ВІКТАР ІВАШКЕВІЧ ІДЗЕ Ў НАСТУП

У сваёй адозве да сяброў партыі намеснік старшыні БНФ Віктар Івашкевіч патлумачыў, чаму ён вылучыўся на пасаду старшыні партыі і раскрытыкаваў сваіх канкурэнтаў – Вінцука Вячорку і Алеся Міхалевіча.

"Фронт у сённяшнім стане не здольны адстойваць незалежнасць Беларусі. І гэта ёсць галоўная прычына майго выбару", — заявіў у адозве Віктар Івашкевіч.

"Я ніколі не вызначаўся павышанымі амбіцыямі і ад утварэння БНФ працаваў на тых накірунках, якія былі вельмі неабходнымі, але ніхто іншы не рашаўся за іх брацца… Бо без усёй гэтай працы немажлівая паўнаварвартасная дзейнасць і барацьба Фронта за незалежнасць. Можна толькі абстрактна дыскутаваць паміж сабой", — лічыць палітык.

Са словаў Івашкевіча, акрамя арганізацыйнай працы і забеспячэння матэрыяльнага падмурку дзейнасці БНФ, пачынаючы з 2004 года ён увесь час вядзе "дыскусію з Вячоркам аб тым, што больш важна – ініцыятыва ці асцярожнасць. Вінцук заўсёды казаў, што галоўнае – не нарабіць памылак. Я перакананы у тым, што галоўнае – дзейнасць, падчас якой, натуральна, дапускаюцца памылкі і якая падпадае пад крытыку. Галоўнае – крытыку ўспрымаць і памылкі выпраўляць. Але ж менавіта старшыня БНФ ёсць рупар публічнай палітыкі, а кіраўнік выканаўчай структуры – толькі выканаўца. Таму ў грамадскай свядомасці БНФ усё больш і больш вызначаўся асцярожнасцю і невыразнасцю. Дайшло да таго, што летам 2006 году фронт цалкам знік з медыйнай прасторы і грамадскай свядомасці, апынуўшыся ў ценю барацьбы за лідэрства паміж беспартыйным А.Мілінкевічам і камуністам С.Калякіным. А на Кангрэсе АДС 2007 году БНФ ледзь назбіраў дэлегатаў, каб утварыць самастойную фракцыю і быць прадстаўленым у прэзідыюме АДС".

Але, на думку Івашкевіча, "самая непрыемная сітуацыя пачалася тады, калі сябры БНФ сталі шукаць сабе лідэра на баку. Аналізуючы гэтае становішча, я прыйшоў да высновы, што фронтаўцы пачалі разбягацца ў розныя "рухі" таму, што не бачылі ў кіраўніку БНФ таго, хто высока ўзняўшы сцяг, павядзе іх да перамогі. Але, каб весці да перамогі, неабходна вылучыць такую праблему і такое патрабаванне, якія былі б падтрыманыя большасцю беларускага народа".

"Сёння мы знаходзімся напачатку крызісу сацыяльна-эканамічнай сістэмы лукашэнкаўскага рэжыму і ўзнікнення новых хваляў сацыяльнага пратэсту. У 2008 годзе мы абавязаныя ўзначаліць гэтыя пратэсты пад бел-чырвона-белым сцягам, бо інакш іх узначаляць крамлёўскія стаўленікі пад сцягам аб'яднання з Расіяй", -- заклікае палітык.

Івашкевіч вызначае ключавыя кампаніі наступнага году: за еўрапейскі выбар; за свабодныя выбары; выбарчая кампанія, "мэта якой стварэнне фракцыі БНФ у Палаце прадстаўнікоў".

**Паводле Радыё Рацыя**

# У ЧАКАННІ ПУЦІНА

## “ЗАЎТРА ЯНЫ ПРЫНЯСУЦЬ ВЯРОЎКУ І ПАВЕСЯЦЦА”

**Заканчэнне. Пачатак на стар. 1**

ца на ўсе былыя крыўды і прыехаць да свайго крыўдзіцеля?

Няма адказу. Але ў маўчання расійскай прэсы ёсць даволі простае тлумачэнне. І палягае яно не ў свірэпай цэнзуры ці закрытасці Крамля. Проста ўся інфармацыя, у тым ліку і агенцтва БелТА, абапіраецца на выказванні кіраўніка чыноўніцкага апарата пад назвай “Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі” Паўла Барадзіна. Гэты чыноўнік сярэдняй рукі даўно вядомы сваімі палітычнымі фантазіямі на тэму інтэграцыі Беларусі і Расіі. Калі браць на веру ягоныя ранейшыя выказванні, дык мы, напрыклад, ад пачатку 2007 году павінны былі ўжо мець адзіную валюту саюзнай дзяржавы. А колькі разоў ён паведамляў пра падпісанне Канстытуцыйнага акта, якое адбудзецца сёння-заўтра – не пералічыць. Павінен жа кіраўнік міждзяржаўнай структуры з агромністым штатам і неслабым бюджэтам неяк апраўдваць сваё і гэтай структуры існаванне.

Гэтым разам Барадзін паведаміў БелТА, што на гэты момант падрыхтаваны 5 (!) варыянтаў канстытуцыйнага акта. Далей варта працытаваць маскоўскага чыноўніка на мове арыгіналу: *“Речь не идет о введении поста союзного президента и союзных министров. Ведь исполнительной власти вполне можно работать коллегиально, как в Европе. В проекте отражается конфедеративная модель устройств Союзного государства, то есть останутся гербы, гимны. При этом необходим союзный парламент, а также делегирование некоторых государственных полномочий на союзный уровень, в частности, полномочий по охране границы, таможне, обороне, военно-техническому сотрудничеству, финансово-кредитной политике, ценовой политике».*

Дык усё-ткі, канфедэратыўная мадэль “устройств”, ці такая, як цяпер у Еўразвязе? І ў чым сэнс візіта Пуціна ў Мінск? Пра што яны будуць гаварыць? Раскладваць пасьянс з пяці варыянтаў саюзнай канстытуцыі?

І ці ўвогуле заслугоўваюць мудрыя выказванні чыноўніка сур’ёзнай увагі аналітыкаў?

Але не ў былым заўгасе Крамля Барадзіне справа.

У мінулым стагоддзі жыў такі ірландскі драматург Сэмюэл Бекет, які лічыцца заснавальнікам “тэатру абсурду”. Героі самай вядомай з ягоных п’есаў — “У чаканні Гадо” – увесь час займаюцца тым, што чакаюць нейкага міфічнага персанажа. Вось фінал п’есы ў кароткім пераказе: “Эстрагон і Ўладзімір хочуць павесіцца, але ў іх няма моцнай вяроўкі. Заўтра яны пырнясуць вяроўку і, калі Гадо зноў не прыйдзе, павесяцца. Яны вырашаюць разысціся на ноч, каб раніцай вярнуцца і зноў чакаць Гадо. “Хадзем”, — кажа Ўладзімір. “Так, пайшлі”, — згаджаецца Эстрагон. Абодва не кранаюцца з месца”.

Пуцін, зразумела, не міфічны персанаж. Але паводзіны тых, хто ўвесь час чакае яго прыезду ў Беларусь, чымсьці нагадваюць паводзіны герояў п’есы абсурду.

**А. Уласаў**

# СКАЖЫ МНЕ, ХТО ТВОЙ СЯБРА

Суседзі

Французская газета Le Monde звяртае ўвагу на тое, што паказчык удзелу ў расійскіх выбарах – 62% – вышэй, чым у 2003 годзе, але ён даволі сціплы, калі ўлічыць, якія сродкі запалохвання былі выкарыстаныя, каб загнаць грамадзянаў на выбарчыя ўчасткі. Колькасць тых, хто не прыйшоў на выбары, паказвае, што ў многіх расіянаў метады ўлады, якія нагадваць пра часы СССР, выклікаюць расчараванне і нават агіду.

Застаецца зразумець, што Пуцін зробіць з гэтай перамогай. Ёнператварыў выбары ў плебісцыт, але так і не сказаў, якія высновы з яго ён зробіць.

Брытанская The Financial Times піша, што перамога Пуціна можа стацца як гарантыяй светлай будучыні, гэтак і праклёнам. Выборы нічога не вырашылі. Але вырашальны момант набліжаецца: 17 снежня «Адзіная Расія» плануе назваць свайго кандыдата ў прэзідэнты. Апошні дзень падачы заявак на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах сканчаецца 23 снежня, нагадвае выданне.




Нямецкая Sueddeutsche Zeitung у матэрыяле «Капіталізм з савецкім тварам» піша, што пакуль няясна, як і для чаго Пуцін скарыстаецца перамогай сваёй партыі. Прапаганда ўбівае ў галовы расіянаў, што стабільнасць у Расіі можа гарантаваць толькі Ўладзімір Пуцін. Небяспека ў тым, што сам шэф Крамля ў гэта верыць. Таму ён можа паспрабаваць у мэтах захавання ўлады пайсці на небяспечны для дзяржавы эксперымент. Магчыма, Пуцін думае пра тое, каб пераняць лейцы кіравання ў якасці лідэра “Адзінай Расіі”, накшталт генеральнага сакратара ЦК КПСС, зрабіўшы прэзідэнта фігурай з чыста прадстаўнічымі функцыямі. Вынікамі такога кроку стаў бы капіталізм з савецкім тварам, піша газета.

З перамогай «Адзінай Расіі» павіншавалі Венесуэла, Іран, а таксама некаторыя краіны СНД: Беларусь, Арменія, Казахстан, Азербайджан. Ад Украіны віншаванні прыслаў Віктар Януковіч, які выконвае абавязкі прэм’ер-міністра. Грузія віншаваць Пуціна адмовілася. З лідэраў еўрапейскіх дзяржаў парадаваўся за Пуціна толькі прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі, чым выклікаў гнеўную рэакцыю праваабаронцаў і апазіцыі. Афіцыйнага віншавання Елісейскага палаца на гэтую тэму не было. А міністр замежных справаў Францыі Бернар Кушнер, у адрозненне ад прэзідэнта, скрытыкаваў парламенцкія выбары ў Расіі.

Прэм’ер-міністр Польшчы Дональд Туск, паводле версіі некаторых расійскіх СМІ, заявіў, што выбары ў Дзярждуму пацвердзілі моцную пазіцыю “Адзінай Расіі”. Аднак, гэта толькі маленькая частка заявы Туска. “Для нас вельмі важна, каб адносіны з Расіяй паляпшаліся, але мы не можам глядзець скрозь пальцы на парушэнне стандартаў дэмакратыі. Калі б Расія следавала гэтым стандартам, яна была б значна больш прывабным партнёрам для нас, ды і для ўсёй Еўропы”, – заявіў польскі прэм’ер. Ён выказаў нязгоду з разгонам мітынгаў апазіцыі напярэдадні выбараў, звярнуўшы асаблівую ўвагу на арышт Гары Каспарава, былога шахматнага чэмпіёна. “Палітычна – ён мой сябра”, — сказаў пра Каспарава Туск.

# ЧАМУ ВЕНЕСУЭЛА НЕ БЕЛАРУСЬ

## РЭФЕРЭНДУМ АБ ПАЖЫЦЦЁВЫМ ПРЭЗІДЭНЦТВЕ ПРАВАЛІЎСЯ

"Ну і лох гэты Уга Чавес" – адначасова выгукнулі у Мінску і ў Маскве. Венесуэльскі кіраўнік зганьбіў "клуб дыктатараў", пацярпеўшы паразу на рэферэндуме.

У тым, што Чавес пераможа, не сумняваўся амаль ніхто. "Уга выдатна спраўляецца", — адзначыў напярэдадні Аляксандр Лукашэнка. І на Захадзе, і ў Расіі вялікіх ілюзіяў наконт поспехаў Чавеса не было, аднак і там, і там лічылі, што "не істотна, як галасуюць, істотна, хто лічыць".

І раптам высветлілася, што на рэферэндуме большасць прагаласавала супраць Чавеса. Прычым для перамогі яму не хапіла менш за 1%. Гэты феномен варты таго, каб разабрацца ў ім дэтальна.

Пачнем з таго, што рэферэндум тычыўся паправак у Канстытуцыю, якія намагаўся ўнесці Чавес. Шмат што ён яўна запазычыў з досведу свайго беларускага калегі. Практычна галоўным пытаннем была адмена абмежаванняў на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў для аднаго чалавека: Чавес заявіў, што мае намер кіраваць Венесуэлай да 2050 году.

Акрамя таго, Уга вырашыў пашырыць свае паўнамоцтвы, падпарадкаваць сабе Нацыянальны банк, замацаваць права нацыяналізацыі прыватнай уласнасці, стварыць у рэгіёнах новыя органы ўлады – Саветы, то бок, фактычна перавесці краіну на прынцыпы сацыялізму. Аднак, каб заахвоціць выбаршчыкаў, у пакет для галасавання таксама былі ўключаныя шэраг папулісцкіх пытанняў. Прыкладам, працоўны дзень прапаноўвалася зменшыць з 8 да 6 гадзін. Таксама размова вялася пра падвышэнне пенсіяў ды іншыя выгоды для простага люду.

**Пачнем з таго, што рэферэндум тычыўся паправак у Канстытуцыю, якія намагаўся ўнесці Чавес. Шмат што ён яўна запазычыў з досведу свайго беларускага калегі**



**Уга Чавес: «Зара спяю!»** *(Здымак падчас візіту прэзідэнта Венесэлы ў Бразілію, калі ён аднойчы сапраўды заспяваў перад публікай. Некалі і Лукашэнка спяваў пад баян.) Фота www.arikah.net*

А той узяў ды не купіўся. І замест "ашаламляльнай перамогі", якую абяцаў сваім прыхільнікам Чавес, атрымалася параза.

Для беларускага грамадства з гэтага вынікае шэраг непрыемных адкрыццяў. Папершае, нават у Венесуэле лічаць галасы. А ў нашай еўрапейскай краіне ўсе вынікі вядомыя задоўга да любых выбараў і рэферэндумаў.

Па-другое, не сакрэт, што значная частка грамадства заключыла з Лукашэнкам пэўны сацыяльны кантракт: ён забяспечвае адносны (падкрэсліваю: адносны) дабрабыт, а выбарцы дазваляюць яму рабіць усё, што заўгодна. Чавес таксама сёе-тое зрабіў для сваіх суайчыннікаў, але, як высветлілася, у іх існуюць і іншыя каштоўнасці, акрамя таннага бензіну і кілбасы (ці бананаў).

Можна знайсці і іншыя паралелі не на карысць сучаснай Беларусі. Да прыкладу, вось як пракаментаваў апошнія падзеі кіраўнік аднаго з раёнаў Каракаса (сталіцы Венесуэлы) Леапольда Лопес: "Мы ўсе шчаслівыя, таму што сённяшнія вынікі – гэта не перамога адной партыі над іншай, гэта перамога дэмакратыі над аўтарытарным праектам".

Вы сабе можаце ўявіць чалавека з падобнымі настроямі на чале якога-небудзь раёна беларускай сталіцы?

Таксама без рызыкі памыліцца можна прадказаць хуткае звальненне цяперашняга кіраўніка Ненецкай аўтаномнай вобласці РФ. Бо гэты рэгіён – адзіны ў федэрацыі, дзе за "Единую Россию" прагаласавала менш за палову выбаршчыкаў. Параўнайце з 99% у Чачні ці хаця б з сярэднімі вынікамі па краіне.

Сутнасць гэтых брэжнеўскіх лічбаў зразумелая кожнаму нармальнаму чалавеку. Але савецкая ментальнасць моцна ўелася ў мазгі некаторых постсавецкіх кіраўнікоў. Калі Лукашэнка ўпершыню заявіў, што за яго ў 2006 годзе прагаласавала 95%, але ён загадаў зменшыць гэты адсотак да лічбаў, больш "еўрапейскіх" – гэта можна было палічыць за няўдалы жарт. Але днямі кіраўнік Беларусі ізноў паўтарыў гэта – у інтэрв'ю іспанскай газеце "Эль Паіс".

Лукашэнка лічыць, што такім чынам дэманструе сваю дэмакратычнасць. Аднак для еўрапейцаў любая фальсіфікацыя вынікаў выбараў – гэта крымінальнае злачынства (між іншым, паводле беларускага заканадаўства таксама). І калі кіраўнік дзяржавы публічна засведчыў сваю непавагу да закону, пра што тут яшчэ можна казаць?!

Быў час, калі Захад збіраўся дэмакратызаваць Беларусь, далучыўшы яе да Расіі. Аднак апошнія падзеі сведчаць, што гэта Масква пераняла досвед Мінска, а не наадварот. Хутчэй ужо можна разлічваць, што Аляксандра Лукашэнку навучыць сапраўднай дэмакратыі Уга Чавес. Тым больш, што кіраўнік Беларусі збіраецца наведаць Венесуэлу яшчэ ў снежні. Так бы мовіць, па гарачых слядах... (Гэты візіт пастаўлены пад сумненне, тым больш, што 13-га чакаецца прыезд у Мінск прэзідэнта Пуціна – заўвага рэд.)

Аднак наўрад ці Лукашэнка возьме на ўзбраенне венесуэльскую мадэль падліку галасоў. Беларускага кіраўніка, хутчэй за ўсе, будзе турбаваць іншае. Перадусім апынулася пад пагрозай "стратэгічнае партнёрства" паміж РБ і Венесуэлай, якое грунтуецца выключна на адносінах паміж цяперашнімі кіраўнікамі гэтых краінаў. Акрамя таго, ёсць яшчэ адзін непрыемны момант. Вядома, што ў Венесуэле беларускі бок збіраўся не толькі здабываць нафту, але і паспеў ужо збудаваць камфартабельныя вілы – так, на ўсялякі выпадак, калі справы на Бацькаўшчыне пойдуць не так, як хацелася б. Аднак цяпер гэты "запасны аэрадром" таксама апынуўся пад пагрозай...

**Валеры Філін**

# ПУЦІНА Ў ГААГУ, НАС НА "САМАНДЫ"

Саюздрук

## АЛЬБО ЯК ПРАВІЛЬНА ВЫМАЎЛЯЦЬ"УЖУПІС"

"Путиниана как политтехнология". Так называецца артыкул Віктара Чыкіна ў газеце "7 дней". У артыкуле галоўны рэдактар не без гумару тлумачыць сутнасць сённяшняй палітычнай сітуацыі ў Расіі.

*"Есть серьезные основания опасаться будущего и у самого Владимира Владимировича. Слишком много «собак» будет навешано на этого человека, если только он не сможет както предупредить, а то и вовсе нейтрализовать столь естественное желание любой новой власти «проклинать предшественника» (…) Могу себе представить XX съезд «Единой России», развенчивающий культ личности Путина и осуждающий эпоху путинского популизма. А если Запад припомнит вторую чеченскую войну, отказ поддержать действия США в Ираке и Иране, вытащит из нафталина истории Политковской и Литвиненко, то тут и до Гааги рукой подать".*

Такое адчуванне, што гэтыя радкі піша чалавек, які прыехаў з краіны, дзе праблемы "культу асобы" зусім не існуе. Зрэшты,назіраючы за тым, якімі тэмпамі з Пуціна робяць божышча, не выключаю, што неўзабаве Лукашэнка на ягоным тле будзе глядзецца вытанчаным еўрапейцам.

А "Беларусь сегодня" абараняе інтарэсы айчыннага рынку.

*"Повышение пошлин на подержанные авто с целью защиты своего производителя — нормальный процесс. Уж какой ажиотаж, какие протесты вызывало это в России несколько лет назад! А позавчера СМИ сообщили: концерн «Фольксваген» открыл в Калуге новый завод с проектной мощностью 150 тысяч машин. Строил чуть больше года — всероссийский рекорд! «Форд», «Тойота», «Рено», «Дженерал моторс» тоже имеют свои заводы в России, другие ведущие производители их строят, некоторые намереваются. Всего за пару лет рынок изменился кардинально. К 2010 году Россия намерена производить более 3 млн. машин, уступая в Европе только Германии. А все начиналось с ввозных пошлин.(...)*

*Фактом была бы точная информация: с такого–то срока, на такие–то машины, на столько–то... Но факта еще нет. А слух уже пошел, за ним — ажиотаж. Ясно же, что «Саманд», машина среднего класса, не закроет все ниши спроса. Кто–то любит машины побольше, кто–то — поменьше, одни хотят джип, другие — минивэн... Но все покупатели, наученные горьким опытом, ждут повышения цен на все машины. Или уже дождались. Позвоните своему продавцу — спросите!"*

Дзякуй за клопат, шаноўная рэдакцыя. Ужо пазванілі, спыталі. Кошты вашымі малітвамі папаўзлі ўгару. Ну чаму чэхі ў свой час не пусцілі Лукашэнку ў Прагу на саміт НАТО? Ён жа тады збіраўся заехаць на завод "Шкода". Глядзіш, мы б ездзілі на праверанай тэхніцы. Зрэшты, дзякуй і на тым, што нам прапануюць перасесці не на кубінскія аўто.

А малады аўтар "Звязды" Уладзіслаў Кузмін наведаў Вільню. Вось некаторыя ягоныя ўражанні.

*"Ці ведалі вы, што ў Вільнюсе ёсць свая незалежная рэспубліка?! Падману тут ніякага няма. Называецца яна Ужупія. Гэта штосьці накшталт маладзёжнага раёна, дзе жыхары самі вырашаюць, як ім жыць. Існуе нават свой парламент і свая канстытуцыя. Вось некаторыя з вытрымак тутэйшых законаў: кожны мае права сяліцца каля ракі, ніхто не мае права сумаваць, ніхто не мае права прыніжаць адзін аднаго і г.д.*

*Ужупія ўяўляе з сабой скрыжаванне дзвюх галоўных вуліц, па баках якіх размешчаны адрамантаваныя жылыя дамы. Але калі зайсці ва ўнутраныя двары квартала, зразумееш, што з савецкага часу тут мала што памянялася. Справа ў тым, што ў Літве ўрад не будзе клапаціцца аб асабістай уласнасці. Калі ты маеш дом ці нейкае яшчэ памяшканне, будзь добры рамантаваць яго сам. У Вільнюсе шмат пабудоў, якія патрабуюць рамонту, але ўсё гэта кладзецца на плечы ўласнікаў. (...)*

*Не правакуйце мясцовую моладзь на дрэнныя паводзіны. Тут нарвацца на непрыемнасці вельмі лёгка. Дастаткова проста загаварыць на замежнай, не літоўскай мове. Вы маеце ўсе шанцы застацца без грошай, без дакументаў і яшчэ атрымаць... Лепш адразу адыходзіць у бок, не ісці на кантакт увогуле. Патрэбную для вас інфармацыю лепш пытаць у людзей ва ўзросце. Проста яны больш стрыманыя і нават яшчэ памятаюць рускую мову. На паліцыю не разлічвайце. Тут складаецца такое ўражанне, што яе ўвогуле няма. Трымайце свае рэчы пры сабе: у Вільнюсе вельмі шмат бедных алкаголікаў, якія ідуць на любыя ўчынкі, каб знайсці грошы. Турысты для іх — найлепшы варыянт".*

Колькі разоў бываў у Вільні, і ні разу на мяне не нападалі ні здзічэлыя віленскія алкаголікі, ні нацыяналістычныя маладзёны. А паслугоўвацца беларускай мовай у Вільні – адно задавальненне. Вас не ўзнагароджваюць цікаўнымі позіркамі суседзі, а персанал выдатна разумее, што такое "кава" і "гарбата". А раёна, які так спадабаўся Уладзіславу, не існуе. Дакладней, ён называецца па іншаму. Па-беларуску гэта "Зарэчча". А па-літоўску "Ужупіс". Націск на першым складзе. Раю вывучыць – каб наступным разам не было канфузу.

**Алесь Канюціч**

# ХТО ПАМЁР?

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО ДА ПАЎТОРАНАГА СТО РАЗОЎ ПРЫВЫКАЕШ

На гэтым тыдні Радыё Свабода арганізуе сустрэчу з групай беларускіх грамадскіх актывістаў і палітыкаў, якія едуць з афіцыйным візітам у Амерыку. Напэўна ж будуць сустракацца з тымі дабрадзеямі, што ўспамагаюць дэмакратычным пераменам у нас. Вінцук Вячорка на тым самым радыё нядаўна казаў, што большая частка дапамогі ідзе якраз на ўтрыманне свабодных сродкаў масавай інфармацыі. Дык, можа быць, у сувязі з усім гэтым будуць дарэчы і мае пытанні, бо запрашалі ж слухачоў задаваць іх.

Першае. Ці слухаюць грамадскія актывісты ды палітыкі свабоднае радыё? Ці праводзіліся апытанні сярод грамадскіх ды палітычных дзеячоў, хто якую станцыю слухае, як ацэньвае?

Другое. Нашы радыёстанцыі дэкларуюць сябе як незалежныя, якія працуюць за грамадскія сродкі дзеля грамадскіх патрэбаў. А якім чынам грамадства можа ўплываць на працу журналістаў?

Моўная заўвага. Пішаш, пішаш, а што толку? "Хто как хаціт, тот так і гаварыт". Да паўторанага сто разоў незаўважна прывыкаеш. Вось я, напрыклад, пачаў прывыкаць, што замест слова "памёр" кажуць "памер". Нядаўна чуў у радыё: "Прэм'ер-міністр Беларусі заявіў: памер..." Сэрца ёкнула – хто ж там памёр, калі сам прэм'ер робіць заяву? Даслухаў фразу да канца – дзякаваць Богу, аказалася, усе жывыя. "... памер дапамогі беспрацоўным будзе павялічаны...". Адлягло.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# ПЛЯШАМ МЫ НАТХНЕННА

## НІХТО НЕ МОЖА ПАДКАЗАЦЬ АДЗІНА ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

Адшумелі інтэрнэтныя жарсці з нагоды візіту некалькіх беларускіх рок-музыкаў у прэзідэнцкую адміністрацыю. Але праблема засталася, дый не магла не застацца, бо яна вечная. Адносіны "мастак – улада", "мастак – моцныя гэтага свету" ніколі не будуць вырашаны канчаткова. Мастак – бы ліяна, можа спарадзіць прыгожыя творы-кветкі, але, каб яны былі бачныя іншым, павінен мець цвёрдую апору, падтрымку. Не было б Мікелянджэла без Ватыкану і Медзічы, Сурыкава – без Трацякова, і гэтак далей. Ці не найбольш пашэнціла нарвежскаму скульптару Густаву Вігелану, над якім дзяржава ўзяла пажыццёвую апеку, дзякуючы якой ён стварыў свой славуты (але, на жаль, невядомы беларусам) Фрогнер-парк у Осла. Але гэта, хутчэй, шчаслівае выключэнне, чым правіла. А правіла дыктуе больш ці менш балючыя кампрамісы, саступкі аж да поўнага продажу душы д'яблу. І кожны выпадак трэба разглядаць індывідуальна, кожны раз гэта праблема выбару самога мастака, ягонага сумлення. Ніхто, ні адна асоба збоку не можа падказаць яму адзіна правільны і маральна бездакорны выбар.

Польскі рэжысёр Кшыштаф Занусі апавядаў, як цяжка было яму адмовіцца ад подпісу пад лістом у абарону арыштаваных дысідэнтаў. Але ён не паставіў гэты подпіс, бо гэта абазначала б для яго адлучэнне ад кіно. А ён палічыў для сябе важнейшым застацца ў сваёй прафесіі, хоць многія яго і тады, і цяпер папракаюць за гэта. (Варта зазначыць, між іншым, што асабліва голасна папракаюць вядомых творцаў за іхнія кампрамісы з камуністычнай уладай тыя, каму гэтая ўлада нічога не прапаноўвала ў сілу іхняй бяздарнасці.)

Не ўсе творцы знаходзяцца ў аднолькавых умовах праз спецыфіку свае дзейнасці. Мастак можа маляваць у сваёй майстэрні ці сваёй хаце, хоць і не мае магчымасці свае творы выставіць, паэт можа пісаць "у стол" або "у інтэрнэт" ці выдаць кнігу за свой кошт. Кінарэжысёр без студыі, без фінансаў – ніхто, тое ж можна сказаць пра кампазітара або дырыжора без аркестра.

Любое мастацтва – як бінарная, двухкампанентная зброя, існуе толькі ў сістэме "твор – спажывец". Верш без чытача – сапсаваны лісток паперы, карціна без гледача... ну і так далей.

Асабліва гэтае пытанне абвастраецца, калі гутарка заходзіць пра рок-музыку. З аднаго боку, паводле свайго вызначэння гэта музыка пратэсту, супраціву. З іншага – частка шоў-бізнесу, а бізнес – гэта рынак, кірмаш, дзе трэба свой тавар прадаць, чым больш і чым даражэй. Калі "Бітлы" пратэставалі супраць вайны ў В'етнаме, гэта толькі павялічвала іхнюю папулярнасць і даходы. А што рабіць у Беларусі, дзе беларускае слова, ці то друкаванае, ці праспяванае – патрэбнае як паветра? Як спяваць, калі табе "перакрываюць кісларод" – канцэртныя залы, экраны TV, радыё? А спяваць трэба, бо інакш тваё месца будзе занятае расійскай ці іншай замежнай "папсой".

І зноў, зноў варта паўтарыць – "кожны выбірае для сябе", як сказаў паэт. Хто цяпер возьмецца адназначна ацаніць выбар Пазьняка ці выбар Казуліна? А ўзяць культуру пасляваеннай Літвы – амаль кожны творца быў калі не сам рэпрэсаваны, дык меў нейкага сваяка расстралянага або сасланага да берагоў мора Лапцевых. І – працавалі, сціснуўшы зубы, і стварылі сваю культуру, за якую не сорамна і цяпер, узгадайма літоўскі тэатр Мільцініса, фільмы Жалакявічуса, прозу і паэзію. Урэшце ўсё вырашае якасць "прадукту". З кім там быў Дантэ? З гвельфамі ці з гібелінамі? І ўвогуле, каму цікава, кім яны былі і чаго хацелі? Паэт Міхал Ціханаў забыты не таму, што "прадаўся бальшавікам", а таму, што гэты шлях прывёў яго да поўнай творчай імпатэнцыі. А вось Шастаковіч здолеў вывесці сваю творчасць паміж Сцылай і Харыбдай...

Калі ж твор мае ўзровень "Танцаў на палянцы", дык ці не ўсё роўна, з кім і для каго "пляшуць натхненна" аўтары такіх опусаў?

**Алег Аблажэй**

# Фотафакт



**Канцэрт рок-гурта** *НРМ у клубе «Графіці». Мінск, 3 снежня 2007 году.*

# Невядомая Беларусь

**6 снежня** нацыянальнае свята Фінляндыі – Дзень незалежнасці, якую фіны прыдбалі ў 1917 годзе. Фінляндыя была адной з краін, што афіцыйна прызналі БНР у 1918 годзе, а ў 1992-м стала адной з першых заходніх дзяржаваў, што ўсталявалі дыпламатычныя дачыненні з Беларуссю.

**7 снежня** 1938 году органы НКВД расстралялі беларускага мовазнаўца Пятра Бузука. Прафесар Бузук быў дырэктарам інстытута мовазнаўства Акадэміі Навук Беларусі і займаўся даследаваннем дыялектаў. Ён склаў першы атлас беларускіх гаворак, які называўся "Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі".

**8 снежня** 1991 году былі падпісаныя Белавежскія пагадненні. Адбылося гэта ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы. Тут кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны Шушкевіч, Ельцын і Краўчук афіцыйна дэнансавалі дагавор аб утварэнні СССР і ўтварылі Садружнасць Незалежных Дзяржаваў.

**9 снежня** 1891 году прыйшоў на свет Максім Багдановіч. Хоць нарадзіўся Максім у Мінску, але большую частку свайго жыцця правёў за межамі Беларусі і памёр далёка ад радзімы. Усяго было яму адведзена 26 гадоў жыцця – акурат столькі Багдановічу хапіла, каб стаць любімым паэтам многіх пакаленняў і класікам беларускай літаратуры.

**11 снежня** 1610 году загінуў самазванец на расійскім царскім пасадзе, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Ілжэдзімітрыя II-га. Гэты чалавек быў папоўскім сынам і настаўнікам у Шклове на Магілёўшчыне, калі яго захапіў вір расійскай палітычнай смуты і ўзнёс на маскоўскі трон, дзе Ілжэдзімітры прасядзеў некалькі месяцаў. Неўзабаве аднак ён мусіў уцячы ў Калугу. Там у часе палявання яго нібы выпадкова, але насамрэч па-здрадніцку забіў ягоны прыяцель.

# «БЕЛСАТ» — З 10 СНЕЖНЯ

## АДЗІНЫ Ў СВЕЦЕ БЕЛАРУСКАМОЎНЫ ТЭЛЕКАНАЛ РОБІЦЦА Ў ПОЛЬШЧЫ І ЛІТВЕ

Праз некалькі дзён, 10 снежня пачне працу новы тэлевізійны канал “Белсат” – плён супрацоўніцтва Польскага і Літоўскага тэлебачання. Пры пасярэдніцтве спадарожнікаў “Астра 1 KR” і “Сірыюс 4” новы тэлепраект будзе транслявацца Польскім тэлебачаннем і падтрыманы Міністэрствамі замежных спраў Польшчы і Літвы. Пачынаючы з 1 студзеня 2008 году трансляцыі “Белсата” будуць доўжыцца 16 гадзін штодня. У Беларусі глядзець гэтыя перадачы змогуць тыя, хто мае спадарожнікавыя тэлеантэны.




**Стваральнікі канала** *Белсат Агнешка Рамашэўска-Гузы, Эдуард Мельнікаў і Кастуціс Пятраўскас. Вільня, 28 лістапада 2007 году.*

— Мы зыходзілі з таго, што кожная краіна і кожная нацыя мае права на свабодную інфармацыі, свабодны абмен думкамі, свабоднае развіццё дыскусій і культуры, — паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Вільні ў інфармацыйным агенцтве ELTA намесніца дырэктара TVP Belsat Агнешка Рамашэўска-Гузы. – Мы вельмі шчаслівыя, што працуем таксама ў Вільні, бо для нас вельмі важна, каб гэты праект быў міжнародным. У самым блізкім часе мы будзем шукаць падтрымкі нашаму праекту з еўрапейскіх і амерыканскіх сродкаў, – сказала сп. Рамашэўска-Гузы.

— Літва вельмі зацікаўленая ў добрым, вартым даверу суседзе і партнёры, якім з’яўляецца беларускі народ, з якім Літву звязвае не толькі глыбокая гістарычная сувязь, але таксама і сучаснасць, — сказаў у сваю чаргу генеральны дырэктар Літоўскага тэлебачання сп. Кастуціс Пятраўскас. У Вільні ў студыі Літоўскага тэлебачання ўжо сёння запісваецца адна з найважнейшых перадач Белсата пад назвай “Форум”.

Прадстаўнік беларускага боку праекта і стваральнік перадачы “Форум” Эдуард Мельнікаў на прэс-канферэнцыі адзначыў, што ініцыятарамі гэтага ўнікальнага праекту з’яўляюцца беларусы. “Гэты праект не завостраны палітычна, — сказаў Мельнікаў. – Мы імкнемся адно задаволіць права людзей, якія хацелі б выказаць свае думкі наконт беларускай рэчаіснасці”.

У кожным выпуску праграмы “Форум” прадстаўнікі беларускіх уладаў будуць мець магчымасць і права не толькі выказаць сваё меркаванне, але таксама выслухаць думкі апанентаў.

Перадачы новага каналу будуць запісвацца ў Варшаве, Беластоку і Вільні, а рэпартажы мяркуецца рабіць як у Мінску, так і па ўсёй Беларусі.

**Паводле “Kuriera Wilenskiego”**

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС
( ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА, ІНДЭКС, ГОРАД, РАЁН, ВОБЛАСЦЬ)
SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 5.12.2007 23:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, вул.Касцюшкі 18